Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (660) Пятніца, 17 сакавіка 1967 года. Год выд. XX. Цана 2 кап.

СІМПОЗІУМ—НА ПАРОЗЕ

Праз некалькі тыдняў у нашым універсітэце адбудзецца першы рэспубліканскі сімпозіум, прысвечаны праблемам тыпалогіі і гісторыі славянскіх моў і ўзаемасувязям славянскіх літаратур. У яго рабоце прымуць удзел вучоныя Мінска і іншых гарадоў Беларусі, а таксама Ленінграда, Львова, Данецка, Фрунзе, Вільнюса, Алма-Аты, Адэсы, Запарожжа, Самарканда, Разані і іншых гарадоў і рэспублік. У праграме гэтай масавай сустрэчы даклады Л. М. Шакуна «Асноўныя праблемы гісторыі беларускай літаратурнай мовы», В. У. Іванова, У. М. Тапарова «Да пытання вывучэння беларускіх купальскіх песень», П. П. Ахрыменка «Значэнне перакладных свецкіх аповесцей XVI—XVIII стагоддзяў у літаратурным яднанні славян», М. Р. Ларчанкі «Праблема вывучэння ўзаемасувязей беларускай літаратуры з літаратурамі іншых славянскіх народаў» — усяго звыш 70 дакладаў і паведамленняў. У першы дзень з дакладам выступіць старшыня Беларускага камітэта славістаў М. Р. Суднік, а на заключным пленарным пасяджэнні намечана заслухаць сумесны даклад мінчан М. Г. Булахава, А. Я. Супруна, Л. М. Шакуна «Развіццё і ўзаемадзеянне ўсходнеславянскіх літаратурных моў у савецкую эпоху».

Ва універсітэце разгарнулася старанная падрыхтоўка да гэтага мерапрыемства. Неўзабаве выйдуць у свет тэзісы дакладаў, якія будуць прадстаўлены на сімпозіуме.

Р. КЛІМАЎ.

ЗА ВЕДЫ ТРЭБА ЗМАГАЦЦА

Савецкі спецыяліст — гэта не толькі віртуоз сваёй справы, але і арганізатар вытворчасці, педагог, носьбіт перадавой навукі і культуры. Ён павінен дасканала ведаць як сваю прафесію, так і мець шырокі палітычны кругагляд, ясна прадстаўляць сутнасць падзей і працэсаў, што адбываюцца ва ўсіх сферах нашага паўсядзённага жыцця. Без гэтага чалавеку цяжка ўсведамляць сваё месца ў шарэнгах будаўнікоў камунізма, бачыць новыя перспектывы, якія адкрываюцца перад савецкім народам і чалавецтвам.

Надзейным арыенцірам у падзеях унутранага і зарубежнага жыцця служыць тэорыя навуковага камунізма. Глыбокія рэвалюцыйныя пераўтварэнні, што адбываюцца на планеце, будаўніцтва камунізма ў нашай краіне яшчэ больш узмацняюць ролю і значэнне гэтай састаўной часткі марксізма-ленінізма. І таму не выпадкова, што ў вышэйшых навучальных установах уводзяцца дзяржаўныя экзамены па навуковаму камунізму. У нашым універсітэце ў гэтым годзе яны будуць праведзены на 4-х курсах біялагічнага, матэматычнага, філалагічнага, геолага-геаграфічнага, хімічнага факультэтаў і на 3-м курсе юрыдычнага факультэта.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ЭКЗАМЕНА ПА НАВУКОВАМУ КАМУНІЗМУ

Прайшоўшая зімовая экзаменацыйна - залікоўая сесія паказала, што значная частка студэнтаў добрасумленна вывучае творы марксізма-ленінізма, дакументы міжнароднага камуністычнага руху, добра арыентуецца ў праблемах навуковага камунізма. Так, на дзённым аддзяленні «добра» і «выдатна» атрымалі 67% студэнтаў, на вячэрнім — амаль 47%, на завочным—43%. Аднак яшчэ вялікая частка студэнтаў паказвае павярхоўныя, слабыя веды і атрымлівае здавальняючыя або нездавальняючыя адзнакі. На вячэрнім аддзяленні 6,3% здаваўшых экзамены атрымалі «нездавальняюча».

Праведзеныя экзамены і залікі і праходзячыя семінары ў гэтым семестры, сведчаць аб дрэнным засваенні некаторымі студэнтамі пытанняў аб барацьбе супраць «левага» і «правага» апартунізму ў рабочым і камуністычным руху, барацьбе супраць сучаснага антыкамунізма. Многія студэнты не маюць ясных уяўленняў аб канцэпцыях немарксісцкага сацыялізма ў развіваючыхся краінах, аб сутнасці некапіталістычнага шляху развіцця народаў, заканамернасцях развіцця сусветнай сістэмы сацыялізма і г. д.

Гэтыя недахопы ў ведах у першую чаргу тлумачацца пропускамі лекцый, недастатковай самастойнай вучобай студэнтаў. Далёка не ўсе пытанні, якія асвятляюцца на лекцыях і ў ходзе семінарскіх заняткаў, можна знайсці ў вучэбных падручніках, але ўсе яны будуць уключаны ў пытанні білетаў на дзяржаўных экзаменах. Заўважаюцца неаднолькавыя

(Працяг на 3 стар.).

Хутка сесія, а яна патрабуе старанней і напружанай вучобы зараз. Гэта добра разумее першакурснік хімфака Слава Дручкоў. Таму так многа часу праседжвае ў фанетычным кабінеце замежных моў.

Фота **А. Кадзета.**



ДРУЖНА І АРГАНІЗАВАНА

12 сакавіка біялагічны корпус нашага ардэнаноснага універсітэта, дзе размясціўся Першы выбарчы ўчастак Ленінскай акругі, абудзіўся раней звычайнага. У святочным убранні студэнты, аспіранты, выкладчыкі, супрацоўнікі накіраваліся сюды, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў нашага народа—кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, гарадскія і раённыя Саветы, прадэманстраваць сваё маналітнае адзінства вакол роднай Камуністычнай партыі. Старэйшая навучальная ўстанова, наш ардэнаносны універсітэт назваў сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ Пятра Міронавіча Машэрава. Упершыню галасуюць студэткі-першакурсніцы сёстры Зіна і Валя Драздова, выпускнік камуніст Мікалай Шлег, студэнты шматлікіх факультэтаў, аспіранты, выкладчыкі апускаюць свае бюлетэні за кандыдатаў, якія прыкладвалі і будуць надалей прыкладваць бацькоўскія клопаты аб далейшым развіцці ардэнаноснага БДУ імя У. І. Леніна, усёй рэспублікі. А першай палове дня выбары тут у асноўным былі закончаны.

Урачыста прайшлі выбары на 13 выбарчым участку Ленінскай акругі, які размясціўся ў гуманітарным корпусе БДУ. Вялікі агітатарскі калектыў, партыйнае бюро філфака прыклалі шмат намаганняў для таго, каб выбары прайшлі, арганізавана, святочна. Для адпачынку выбаршчыкаў студэнты універсітэта арганізавалі вялікі і разнастайны канцэрт.

І СКАРАЧАЮЦЦА АДЛЕГЛАСЦІ...

Цяжка нават пералічыць, колькі слаўных спраў на рахунку літаратурнага аб'яднання «Узлёт». Гэта і чытанне сваіх вершаў перад студэнтамі нашага універсітэта, і выезды на фабрыкі і заводы па запрашэнню рабочых, і цікавыя вечары паэзіі ў суседніх раёнах Мінска.

Але вось нядаўна узлётаўцы атрымалі цікавы ліст. Былы студэнт філалагічнага факультэта, а цяпер выкладчык беларускай мовы і літаратуры Несцераўшчынскай васьмігадовай школы, што на Віцебшчыне, прасіў паэтаў прыехаць у школу...

— Што рабіць? — раіліся узлётаўцы. — Далёка ехаць, гэта табе не Барысаў ці Дзяржынск, што раз-два—і там. Але настаўнік просіць, школьнікі будуць чакаць... Калі ў суботу сесці на цягнік, то да панядзелка можна вярнуцца на заняткі...

Уладзімір Дзюба, Мар'ян Дукса, Анатоль Казловіч, Сяргей Законнікаў прыехалі ў госці да Уладзіміра Януковіча і яго вучняў. Тут яны пазнаёміліся з яго працай у школе, падзяліліся думкамі аб сучаснай беларускай паэзіі. А вечарам, калі актавая зала была запоўнена вучнямі, прачыталі свае вершы, расказалі аб творчых планах, студэнцкім жыцці. Вечар сустрэчы адбыўся не толькі ў школе. Па запрашэнню хлебаробаў вёскі Несцераўшчыны ўзлётаўцы прыйшлі таксама ў калгасны клуб. Зала была перапоўнена. Сабралася шмат жадаючых паслухаць галасы маладых. З уступнай часткай выступіў Уладзімір Януковіч. Ён знаёміць прысутных з прыехаўшымі гасцямі. Цішыня. Адзін за другім падыходзяць да трыбуны паэты. Яны чытаюць вершы аб нашым родным краі, аб роднай Беларусі і стваральнай працы яе народа. Калгаснікам спадабаліся вершы, якія яны слухалі ў гэты памятны для іх вечар. Закончылася чытанне вершаў і адразу ж завязалася цікавая гутарка з калгаснікамі. Колькі цёплых слоў, пажаданняў можна было пачуць у час развітання з калгаснікамі і школьнікамі:

— Дзякуй вам, хлопцы! Прыязджайце да нас яшчэ!

У. АСКІРКА.

ДРУЖБА ЗА ЎСЁ ДАРАЖЭЙ!

Многа добрых спраў на ўліку Савета Дружбы нашага універсітэта, якім кіруе Света Осіпава. Вечары адпачынку, выезды на прадпрыемствы сталіцы і бліжэйшых раёнаў, дзе замежныя сябры знаёмяцца з жыццём і культурай савецкіх людзей, культпаходы ў тэатры, канцэрты і іншае.

А нядаўна Савет Дружбы універсітэта сумесна з студэнцкімі саветамі інтэрнатаў № 2 і № 3, што па вуліцы Бабруйскай, арганізаваў цікавы «агеньчык», у якім прынялі ўдзел савецкія юнакі і дзяўчаты і студэнты розных краін і кантынентаў. Арганізатары і кіраўнікі «агеньчыка» зрабілі ўсё для таго, каб прысутным было весела і радасна. Нацыянальныя танцы, песні, сяброўскія поціскі рук стварылі на вечары абстаўіны шчырасці і братэрства моладзі чатырох кантынентаў, жаданне заўсёды жыць, як брат з братам, сястра з сястрой, каб ніколі светлае ззянне сонца не закрывалі пажары вайны, а радасць і ўсмешкі ніколі не зыходзілі з твараў людзей.

Асаблівую цеплыню, пяшчотнасць і ўсхваляванасць выклікалі ў сэрцах удзельнікаў «агеньчыка» словы: «Дружба за ўсё даражэй!», якія сканцыравала хорам моладзь на розных мовах народаў.

Б. СЯМЁНАЎ.

ЯКІ ЁН, СТУДЭНТ ЮБІЛЕЙНАГА ГОДА?

У сёмым нумары нашай газеты быў надрукаваны артыкул «Трынаццаць мужных», у якім востра пастаўлена пытанне аб арганізацыі сістэматычнай падрыхтоўкі да экзаменаў на працягу ўсяго семестра. Матэрыял выклікаў водгукі ў студэнтаў і выкладчыкаў. Некаторыя з іх мы ўжо надрукавалі. У папярэднім нумары з артыкулам «Што значыць быць культурным?» выступіла дацэнт Е. Л. Бондарава. Наогул, чытачы павялі сур'ёзную гутарку і размову аб тым, якім ёсць і павінен быць студэнт юбілейнага года? Сёння мы працягваем друкаваць матэрыялы на гэтую тэму.

Непатрэбная шчырасць

Не так даўно на старонках газеты з'явіўся матэрыял С. Косава «Скажу шчыра». Я і мае таварышы студэнты-журналісты былі крыху абражаны такім беспадстаўным выступленнем. Таварыш Косаў піша, што матэматыкам даводзіцца працаваць на працягу ўсяго года, а «некаторыя студэнты філалагічнага факультэта» прачытваюць праграмную літаратуру за... некалькі дзён.

Што ж, старая спрэчка ўзнікла зноў. Толькі раней яна выглядала як спрэчка фізікаў і лірыкаў, зараз жа больш канкрэтызавалася. Але што добрага нясе вырашэнне такой складанай праблемы, як тое, каму больш, а каму менш вучыць? На мой погляд, падобныя спрэчкі толькі перашкаджаюць вучыцца. І філолаг і матэматык паступаюць на адпаведны факультэт толькі для таго, каб вучыцца, каб авалодаць любімай спецыяльнасцю. Нельга абвінавачваць студэнта-філолага за тое, што ён паступіў менавіта на філалагічны факультэт: яму падабаецца філалогія, ён вырашыў прысвяціць сваё жыццё гэтай навуцы. Студэнт-матэматык мае сваёй мэтай авалодаць другой навукай — матэматыкай. Абодва студэнты стаяць на правільнай жыццёвай дарозе. Што з таго, што яны вывучаюць розныя прадметы? Кожны прадмет мае свае цяжкасці — гэта спецыфіка. Ніхто не зможа адказаць на пытанне, што цяжэй, філалогія ці матэматыка. Ды і ставіць такое пытанне недарэчна.

Гутарку трэба весці, і вельмі сур'ёзна, аб тым, што на ўсіх факультэтах аказваюцца студэнты, якія павярхоўна вывучаюць рэкамендаваную выкладчыкамі літаратуру, дый часта абмяжоўоюцца толькі «абавязковымі спісамі». Я не веру, што з такога студэнта можа атрымацца добры спецыяліст. Студэнцкія гады і радасныя, і цяжкія. Але гэта для тых, хто добрасумленна выконвае свае абавязкі, хто шчыра любіць сваю будучую прафесію, імкнецца найбольш поўна авалодаць яе сакрэтамі.

Большасць студэнтаў — філолагаў паважае сваю навуку і зусім не думае вывучыць яе за некалькі дзён. Падмацаваннем гэтых слоў можа быць той прыклад, што на філалагічным факультэце з кожным годам расце лік выдатнікаў вучобы, што ў навуковых гуртках па вывучэнню мовы і літаратуры з поспехам працуюць дзесяткі і сотні юнакоў і дзяўчат.

Калі студэнт пачынае разважаць над тым, якая навука лягчэй, яму лепш не ісці ў інстытут або універсітэт. Гэта сведчыць аб тым, што ён яшчэ не знайшоў сваю, іменна сваю прафесію.

П. ПАБОКА,
студэнт трэцяга курса філфака.

У будучым Віктар Сацуковіч стане журналістам, але для гэтага патрэбны шматгранныя і багатыя веды. Ён і імкнецца іх набыць ва універсітэце. Фота У. Аскіркі.

ВАСЕМНАЦЦАЦІГАДОВЫЯ

НА НАШЫМ курсе займаецца шмат дзяўчат. У нас ёсць Люды (чатыры), Светы, Томы, Алы, Ані... Усім ім па васемнаццаць, ва ўсіх біяграфій кароткія, як і само іх жыццё.

ВОСЬ, напрыклад, Люда Гаражанкіна. Прыехала яна на вучобу ў БДУ з братняй Украіны, з-пад Кіеўшчыны. Яна выдзяляецца сярод сваіх сябровак жвавасцю і весялосцю. Чароўная ўсмешка Люды мала калі зыходзіць з прывабнага твару, і, відаць, пакарыла не аднаго юнака. Яна—заўзяты аматар спорту, а любімае «хоббі»—баскетбол. У канцы мінулага года Люду ўключылі ў састаў зборнай універсітэта. І хаця шмат часу Гаражанкіна траціць на трэніроўкі і спартыўныя паядынкі, але гэта не перашкаджае ёй добра вучыцца.

НАТАША Захарава — ціхая, задумёная дзяўчына. Яна вельмі любіць музыку. Прыгожа выконвае творы Шапэна, Чайкоўскага, Глінкі... І яшчэ адна асаблівасць Наташы — заўсёды старанна рыхтавацца да семінарскіх заняткаў, уважліва слухаць сваіх настаўнікаў. І наогул, Наташа — шчаслівая дзяўчына. «Шчаслівыя» білеты ей, як адзін, пападаліся на экзаменах у час зімовай сесіі. Таму стала круглай пяцёрачніцай.

ЯДЗЮ Халява ўжо цяпер можна назваць няштатным карэспандэнтам газеты «Знамя юности». Яна змагла надрукаваць там ужо больш як пяцьдзесят матэрыялаў. А калі ўлічыць, што ёй зусім нядаўна споўнілася толькі васемнаццаць, то можна зразумець, што журналіст з яе атрымаецца выдатны.

ЗАЗЁРНАГА краю Віцебшчыны прыехала на вучобу ва універсітэт Ала Красінская. Гадоў ёй не больш, чым Ядзі, але ўжо змагла на выстаўку твораў аддзялення друкаваць шмат сваіх артыкулаў і вершаў. Юную паэтэсу хвалюе многае: вясна, каханне, вучоба, дружба. Таму яна так многа любіць марыць.

Карацей, не здарма ж кажуць у народзе, колькі дзяўчат—столькі і характараў. Што ж, Люды, Светы, Томы, Алы, Ані, вы паспяхова закончылі вучобу ў школе, непрыкметна пралятуць вучоба і ва універсітэце. Вам толькі па васемнаццаць, але вы ўжо даказалі, што сваёй вучобай, працай, удзелам у грамадскім жыцці прыносіце радасць людзям. Хай працоўнае натхненне і шчасце будуць заўжды вашымі лепшымі спадарожнікамі!

Г. МАЦУК,
студэнт першага курса аддзялення журналістыкі.

Студэнтка геолага-геаграфічнага факультэта Наташа Леус вучыцца на выдатна. Аднакурснікі даверылі ёй адказнае заданне — узначальваць камсамольскую групу.

Фота А. Кадзета.

ІНДЫКАТАРЫ НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ

Штогод кожны факультэт нашага універсітэта прымае актыўны ўдзел у рэспубліканскім аглядзе студэнцкіх навуковых прац. Яны становяцца як бы індыкатарамі плённай даследчай работы студэнтаў, падводзяць вынікі іх дасягненняў. Больш двух месяцаў прайшло з таго часу, як закончыўся рэспубліканскі агляд. Пара аглянуцца назад, паразважаць над добрым і дрэнным, падзякваць тым, хто аказваў і аказвае вялікую дапамогу СНТ.

Вынікі агляду гэтага года на нашым фізічным факультэце прыблізна ахарактарызавалі сапраўднае становішча даследчых спраў студэнтаў. Відаць, гэтае назіралася таксама і на іншых факультэтах. Справа ў тым, што навуковых прац у камісію было прадстаўлена ў невялікай колькасці. Гэта здараецца па розных прычынах, і самая галоўная з іх, на маю думку,—недастатковая актыўнасць некаторых студэнтаў, адсутнічанне ў іх цікавасці да СНТ. Кіраўніцтву СНТ універсітэта, а таксама факультэтаў неабходна падумаць аб тым, каб павысіць зацікаўленасць студэнтаў да ўдзелу ў аглядах. Таму што нідзе няма такой шырокай магчымасці прадставіць навуковую работу студэнцтва, як тут. Нават на навуковых канферэнцыях колькасць дакладаў абмяжоўваецца. Таму мы як мага больш павінны выкарыстоўваць рэспубліканскі агляд.

Чым жа парадаваў студэнтаў-фізікаў нядаўні агляд? З трыццаці навуковых прац дваццаць тры ўдастоены высокай адзнакі — першай катэгорыі, пяць — другой і дзве — трэцяй. Усяго ў гэтым мерапрыемстве прынялі ўдзел сорак адзін студэнт.

Сёлета лепш за іншых выступіла секцыя антэн кафедры радыёфізікі і электронікі (кіраўнік секцыі кандыдат тэхнічных навук А. М. Казарын) і кафедра электрафізікі (загадчык прафесар В. Г. Вафіядзі).

Яшчэ адной выдатнай рысай агляду быў актыўны ўдзел у ім замежных студэнтаў. Хочацца павіншаваць Эмілію Касануэва, Чан Мінь Тхай, Тхай Кін Нгуен, Нгуен Ван Быонг, Фан Ан. Іх навуковыя працы удастоены першай катэгорыі.

Дваццаць пятага сакавіка ў нас у Мінску пачнецца трынаццатая студэнцкая навуковая канферэнцыя вну Латвіі, Літвы, Эстоніі, Калінінградскай вобласці. Будзем спадзявацца, што студэнты не толькі фізічнага, але і іншых факультэтаў прачытаюць на ёй многа цікавых дакладаў.

Б. ЗАМСКІ,
старшыня СНТ фізічнага факультэта.

ЗА ВЕДЫ ТРЭБА ЗМАГАЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.).

адносіны да вывучэння тэорыі навуковага камунізма не толькі ў некаторых студэнтаў, але і ў цэлых групах. Відавочна, што на тых факультэтах і ў групах, дзе дэканаты і грамадскія арганізацыі сістэматычна кантралююць вывучэнне студэнтамі марксісцка-ленінскай тэорыі, там вышэй паспяховасць і дысцыпліна студэнтаў.

Нядрэнна, напрыклад, здалі экзамены студэнты пятага курса гістарычнага факультэта. Найбольш глыбокія веды паказалі тыя, хто добра рыхтаваўся да заняткаў на працягу года, чытаў многа дапаможнай літаратуры, глыбока вывучаў першакрыніцы. Студэнтка Качура змястоўна і ўпэўнена раскрыла пытанні «Антыкамунізм — галоўная ідэйна-палітычная зброя імперыялізму» і «Сацыяльна - эканамічныя пераўтварэнні ў пераходны перыяд ад капіталізма да сацыялізма». Выдатныя адзнакі атрымалі таксама Ладысеў, Сажнеў, Стадуб, Паўлаў і іншыя.

Наадварот, слабыя веды студэнтаў, пропускі заняткаў можна сустрэць у многіх групах фізічнага і некаторых групах матэматычнага факультэтаў. Гэта асабліва ярка праяўляецца ў групах ядзернай фізікі і электрафізікі пятага курса фізічнага факультэта. Студэнты Данілаў, Ланавой, Жукаў, Мельнікаў, Трафімовіч і іншыя паказваюць выключна недобрасумленныя адносіны да вучобы.

Несур'ёзныя адносіны да вывучэння навуковага камунізма заўважаецца ў многіх студэнтаў 5, 6, 10 груп пятага курса фізічнага факультэта. Таму не выпадкова, што студэнтам гэтых груп Рогачу, Юшкоўскаму, Емяльянаву, Чумакову і іншым прыйшлося пераздаваць залік па навуковаму камунізму.

Прыкладам недобрасумленных адносін да вывучэння навуковага камунізма з'яўляецца на матэматычным факультэце 7 група чацвёртага курса. З дванаццаці студэнтаў групы пяцёра — Абрамовіч, Болбел, Шэрман, Караткевіч, Вальчэўскі атрымалі незалік.

На біялагічным факультэце на чацвёртым курсе больш актыўна і арганізавана праходзяць семінарскія заняткі па навуковаму камунізму ў 1 і 2 групах у параўнанні з 3 і 4 групамі. Слабыя веды марксісцка-ленінскай тэорыі паказваюць студэнты Фральцова, Гашэнка, Шарэц, Гусак, Рабцава, Папова, Власава, Каховіч і іншыя.

Больш патрэбна ўдзяляць увагі глыбокаму вывучэнню тэорыі навуковага камунізма таксама і студэнтам пятага курса біяфака Арцімоўскай, Бандарчук, Ягоравай, Міхей, Вязіцкаму, Бую.

Нядрэнна ў цэлым праходзяць заняткі па навуковаму камунізму на чацвёртым курсе хімічнага факультэта.

На юрыдычным факультэце добрасумленныя адносіны да вывучэння навуковага камунізма паказваюць студэнты Мілто, Каротчанка, Панцюхоў, Саўчанка, Слуцкі,, Трэцякоў, Маляўка. У апошні час значна палепшылі сваю падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў студэнты Гілеп, Мішкевіч, Хаткевіч, Прошын, Шульман, Шалімо. Аднак студэнты Раўнаполец, Шкляр, Місевіч, Мятнікаў, Лук'янаў, Лаўрова і некаторыя іншыя па-ранейшаму часта прапускаюць і дрэнна рыхтуюцца да семінараў.

Агульным недахопам падрыхтоўкі да заняткаў многіх студэнтаў з'яўляецца недастатковае выкарыстанне дапаможнай літаратуры. Некаторыя студэнты не могуць выкарыстаць веды, набытыя пры вывучэнні іншых грамадска-палітычных навук, звязаць палажэнні навуковага камунізма з спецыяльнымі дысцыплінамі.

На многіх семінарскіх занятках пераважае механічнае пераказванне студэнтамі вучэбных дапаможнікаў, адсутнічае творчы падыход да аналіза праблем навуковага камунізма, заснаваны на глыбокім вывучэнні і ўсведамленні марксісцка-ленінскага вучэння.

Кафедра навуковага камунізма на сваім пасяджэнні падвяла вынікі залікова - экзаменацыйнай сесіі, абагуліла практыку выкладання і вывучэння тэорыі навуковага камунізма. У пастанове кафедры вызначаны шляхі далейшага павышэння якасці выкладання марксісцка-ленінскай тэорыі, паляпшэння і ўдасканалення методыкі правядзення семінарскіх заняткаў. Больш глыбокаму вывучэнню навуковага камунізма павінна таксама садзейнічаць павышэнне запатрабавання да ведаў студэнтаў на семінарскіх занятках і да іх адказаў на будучых экзаменах.

А. Д. ГУСЕЎ,
дацэнт кафедры навуковага камунізма, кандыдат філасофскіх навук.

Ардэнаносны Універсітэт — 50 гадоў Савецкай улады

СЛОВА МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

На філалагічным факультэце штогод праходзяць традыцыйныя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя дню нараджэння У. І. Леніна. У канферэнцыі 1966 года ўдзельнічалі маладыя вучоныя універсітэта, Мінскага, Брэсцкага, Мозырскага педінстытутаў і Інстытута мовазнаўства АН БССР. Нядаўна вышаў зборнік з матэрыяламі гэтага форума. Ён адкрываецца змястоўным дакладам выкладчыка І. І. Лушчыцкай аб літаратурна-эстэтычных поглядах Галіны Нікалаевай. Цікавасць у чытачоў выклікаюць артыкулы В. І. Дубовіка «У .І. Ленін аб мастацтве публіцыстычнага слова», Р. І. Брагіна «Да пытання аб станаўленні антыкаланіяльнага рамана ў сучаснай англійскай літаратуры», В. П. Рагойшы «Свабодны верш (Да пытання характару свабоднага верша Максіма Танка)», П. І. Ткачова «Што такое памфлет?» і іншыя. Н. М. Піпчанка, М. В. Томусава, В. К. Кавалёў, А. І. Падлужны і іншыя прадстаўлены матэрыяламі па мовазнаўству. Усяго ў зборніку надрукавана дваццаць два артыкулы. Усе яны напісаны на высокім навуковым узроўні і грунтуюцца на актуальных пытаннях рускай, беларускай, замежнай літаратуры, журналістыкі, рускай, беларускай, польскай і балгарскай моў.

Цяпер на факультэце ідзе падрыхтоўка да новай навуковай канферэнцыі, якая адбудзецца ў ленінскія дні.

А. МАКСІМАЎ.

СТВАРАЕЦЦА ФОТАКЛУБ

У нашым універсітэце многа аматараў фатаграфіі. На філалагічным, гістарычным і іншых факультэтах часта арганізоўваюцца фотавыстаўкі, рыхтуюцца фотарэпартажы аб шматгранным жыцці і працы студэнцтва. Усім запамяталіся такія матэрыялы аб цалінніках-будаўніках, аб экскурсіях у гераічную Брэсцкую крэпасць, па памятных мясцінах Ленінграда, Масквы і іншых гарадоў. Цікава адлюстроўваюць свае паходы географы.

Але да гэтага часу ў нас не было такога цэнтра, які б аб'ядноўваў усіх аматараў фатаграфіі, дзе б можна было мяняцца творчымі планамі і думкамі, павучыцца на лепшых прыкладах. Па ініцыятыве рэктарата, парткома, мясцкома і камітэта камсамола, а таксама кафедраў аддзялення журналістыкі цяпер ва універсітэце ствараецца фотаклуб. У яго журы ўвайшлі: Аўдзееў—кінааператар к/ст. «Беларусьфільм», Бондарава—член СК СССР, Драчоў—більдрэдактар часопіса «Бярозка», Дзітлаў—старшыня фотасекцыі СЖ СССР, Ждановіч—фотакарэспандэнт часопіса «Маладосць», Кудраўцаў — студэнт аддзялення журналістыкі, Ледзянёва—мастак, Нікалеў—студэнт аддзялення журналістыкі.

Фотаработы здаваць: на гістарычным факультэце В. Галубовіч (2 курс), на юрыдычным — Бакунову ці Дарогіну, на матэматычным—Л. Дычкіну (2 курс), на фізічным—У. Вароніну (2 курс). Акрамя гэтага, работы можна здаваць у камітэт камсамола.

Галоўнай задачай фотаклуба на бліжэйшае будучае з'яўляецца стварэнне летапісу жыцця і дзейнасці нашага ардэнаноснага універсітэта, яго ўклада ва ўсенародную падрыхтоўку да 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У нас ёсць усе магчымасці стварыць такія фоталетапісы (альбомы, стэнды і выстаўкі) на кожным факультэце.

А. СІДАРОВІЧ.

АМАТАРЫ ФАТАГРАФІІ, АД ВАС САМІХ ЗАЛЕЖЫЦЬ ПЛЁННАЯ І РАЗНАСТАЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КЛУБА! ТУТ ВЫ АТРЫМАЕЦЕ НЕАБХОДНЫЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ І ДАПАМОГУ, НАВУЧЫЦЕСЯ СТВАРАЦЬ ЗАПАМІНАЛЬНЫЯ КАРЦІНЫ ЖЫЦЦЯ, ВОБРАЗЫ СУЧАСНІКАЎ. ВАШЫ ФАТАГРАФІІ МОГУЦЬ СТАЦЬ КАШТОЎНЫМІ ДАКУМЕНТАМІ ЮБІЛЕЙНАГА ГОДА.

Фотаінфармацыя

Тэарэтычная вучоба хіміка цесна звязана з лабараторнымі вопытамі, даследаваннямі. Наш фотакарэспандэнт Ю. Мароз сфатаграфаваў момант прыёма сінтэзаў выкладчыкам Ларысай Пятроўнай Адамовіч у першакурснікаў.

Многа дзіўных і запамінальных гісторый прыходзілася чуць замежным студэнтам пра гаспадара тайгі мядзведзя. Таму ў час наведвання заалагічнага музея нашага універсітэта яны доўга «знаёміліся» з гэтым дзіўным «артыстам» амаль кожнага цыркавога прадстаўлення. У музеі яны даведаліся таксама аб багатым жывёльным свеце Беларусі. Тут прадстаўлены такія жывёлы як ласі, бабры і іншыя. Асаблівае захапленне выклікаў у студэнтаў беларускі зубр.

На здымку: замежныя студэнты ў заалагічным музеі.

ЦІКАВАЯ ГУТАРКА

Кафедра гісторыі філасофіі і логікі (загадчык прафесар М. І. Лушчыцкі) арганізавала для замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў нашым універсітэце, цікавую гутарку аб маральным вобліку савецкага маладога чалавека. Лектар кандыдат філасофскіх навук С. Д. Лапцёнак прывёў шмат пераканаўчых прыкладаў праяўлення высокіх маральных якасцей нашай моладдзю, падрабязна спыніўся на яе ўдзеле ў камуністычным будаўніцтве і ў падрыхтоўцы да 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У заключэнне С. Д. Лапцёнак адказаў на пытанні слухачоў.

С. РАБЦАЎ.

ВІНШУЕМ!

1953 год у жыцці Галіны Іосіфаўны быў адным з важнейшых. Паспяхова скончыўшы дзесяць класаў Гарадзейскай сярэдняй школы, яна паступіла на біялагічны факультэт нашага універсітэта. Ужо на другім курсе вучобы актыўна ўключаецца ў навукова-даследчую работу гуртка пры кафедры сістэматыкі раслін. Тут яна выканала сваю першую работу па біялогіі пустазелля, якая на рэспубліканскім аглядзе лепшых студэнцкіх работ была ўдастоена першай катэгорыі. Гэтая работа перарасла спачатку ў курсавую, а затым і ў дыпломную.

Па заканчэнню біялагічнага факультэта ў 1958 годзе Галіна Іосіфаўна вярнулася ў родную школу, але ўжо ў якасці выкладчыка біялогіі і хіміі.

Два гады працы ў школе, два гады думак аб навуцы.

Паступіўшы ў вочную аспірантуру, яна на выдатна здала ўсе прадметы кандыдацкага мінімуму, многа і ўпарта працавала над біялогіяй прарастаючага пустазелля.

Пасля паспяховага заканчэння аспірантуры была пакінута на працу асістэнтам кафедры сістэматыкі раслін.

21 лютага гэтага года на пасяджэнні Аб'яднанага Вучонага Савета па біялагічных і геаграфічных навуках пры БДУ імя У. І. Леніна адбылася абарона дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук Галіны Іосіфаўны Зубкевіч на тэму «Некаторыя пытанні біялогіі насення пустазелля». Вучоныя нашага універсітэта адзінагалосна прысудзілі ёй вучоную ступень.

Ад усёй душы віншуем Галіну Іосіфаўну і жадаем новых творчых поспехаў на навуковай ніве.

П. Г. ЛАЗАВАЯ.

Мар'ян Дукса

ВЯСНА

Я прыйшла —
Вы мяне выклікалі.
Быццам венікам, снег
падмяла.
Я вясна — галасістая каня.
Я вярнулася.
Я прыйшла.
Салаўя аж з-пад сонца
прынесла —
Не журыцеся больш
кусты!
Сёння песню, рачную
песню
Разгайдалі,
панеслі плыты.
А ў мяне столькі
клопатаў...
Сок галінкай цягнуць
да нябёс,
Каб да 1 мая
лопнуліся
У паветры пупышкі бяроз.
А ў мяне яшчэ стрэчы,
стрэчы, —
Цераз выган і гай шляхі.
Ай, ці скора, — гадае
зарэчча, —
Заварушацца лапухі.
Цымбалісты!
Наладжвайце струны,
Клічце хаты дзяўчат
чараду —
Столькі сэрцаў
распусцілася юных!..
Я спяшаюся.
Я іду.

Мой родны край.

Фота У. Аскіркі.

Усё адчувальней і адчувальней пачынае прыгравaць вясновае сонца...

Фота А. КАДЗЕТА.

ПЕРШЫЯ ПОДЫХІ

Нягай ляжыць сабе яшчэ ў парках і скверах снег, а на галінках дрэў замест зялёных почак звісаюць празрыстыя кроплі ад першых вясенніх туманоў, подых вясны становіцца усё больш і больш глыбокім і адчувальным.

Снег. Не, гэта ўжо не той снег, якому мы так радаваліся ў пачатку зімы, які дзівоснымі пушынкамі лажыўся на нашы гарачыя далоні і ўзбуджаў нястрымнае пачуццё радасці, выкліканае пераменамі ў прыродзе! Цяпер жа, счарнелы і парэзаны першымі танюсенькімі ручаінамі, ён марудна і ляніва ссоўваецца ў разняволеную сонцам Свіслач.

Але заглянем у студэнцкія пакоі. Вясна сюды прыходзіць раней, чым звычайна. Нясцерпнымі рукамі адкрываюцца вокны — і пакой захлынаецца ад новага свежага паветра. Адчуўшы цяпло, цягнуцца са шклянай пасудзіны да сонца толькі што народжаныя кволыя лісточкі вярбы, цягнуцца да яго і сапраўдныя жывыя кветкі, купленыя на кірмашы ў старога грузіна.

Так. Вясна ідзе. Вышэй паднялося сонца, хутчэй забегалі трамваі, гучней зазвінелі дзявочыя абцасы. Ажылі кіёскі, паказалі свой твар вітрыны. Расце чарга ля тэлефонных будак і тэатраў. Нараджаюцца новыя сустрэчы ў закаханых, новыя вершы — у паэтаў.

Вясна ідзе. Вы не сустракалі яе? Адкрыйце вокны. З першым вясеннім ветрам да вас прыдуць новыя надзеі і крылатыя мары, бадзёры настрой і нястрымны прыліў энергіі.

А. Свораб.

НАШ ГОСЦЬ — АНДРЫС АНДРЭЙКА

Імя выдатнага шашыста Анатоля Гантварга — студэнта першага курса матэматычнага факультэта нашага універсітэта добра вядома не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Чатырохразовы чэмпіён СССР сярод юніораў па міжнародных шашках, чэмпіён УЦСПС мінулага года, чэмпіён Беларусі сярод студэнтаў. У мінулым годзе ён удзельнічаў на першынстве СССР па шашках сярод дарослых і заняў 7 месца. Гэта дало яму права ўдзельнічаць у Міжнародным турніры «Брынта», які пачнецца 5 мая гэтага года ў Галандыі. Падрыхтоўка да гэтага спаборніцтва пачалася ўжо цяпер. Выдатныя дэбюты на шашачных дошках Анатоля выклікалі ўвагу да яго майстэрства вядомых шашыстаў краіны. Некаторыя з іх пажадалі быць трэнерамі Гантварга. У панядзелак прыехаў да нас прэтэндэнт на сусветную карону рыжскі гросмайстар Андрыс Андрэйка, які правядзе з Анатолем вучэбна-трэніровачны збор, у часе якога яны побач з заняткамі па тэорыі згуляюць трэніровачны матч з шасці партый. Андрыс Андрэйка прабудзе ў нашым універсітэце да 22 сакавіка.

У ДАПАЎНЕННЕ ДА НАДРУКАВАНАГА

ЗА ШАШАЧНАЙ ДОШКАЙ — ВЫКЛАДЧЫКІ

Як ужо паведамлялася, актыўны ўдзел у першай спартакіядзе супрацоўнікаў, прысвечанай 50-годдзю Савецкай улады, прынялі шашысты. Упартыя паядынкі разгарэліся паміж камандамі фізічнага, матэматычнага, хімічнага, гістарычнага і біялагічнага факультэтаў, а таксама вылічальнага цэнтра і кафедры фізвыхавання і спорту, якія змагаліся за ганаровы прыз мясцкома. Сярод удзельнікаў былі майстар спорту і тры кандыдаты ў майстры.

Упэўнена правяла баі каманда вылічальнага цэнтра, якая выступіла ў такім складзе: кандыдат у майстры Г. Драбушэвіч, чэмпіёнка СССР сярод студэнтаў А. Хапалюк і першаразраднік Ч. Роліч. Толькі другім прызёрам, фізікам і прадстаўнікам кафедры фізічнага выхавання, удалося дабіцца нічыёй у сустрэчы з імі. Нядрэнныя поспехі паказалі фізікі, яны занялі другое месца ў турнірнай табліцы. За факультэт выступалі майстар спорту Г. Пятровіч і другаразраднік Галко і Ткачук. Трэцімі аказаліся матэматыкі. Першаразраднік А. Тузік, другаразраднікі А. Самсонаў і М. Юрчук прадэманстравалі выдатныя шашачныя дэбюты, цікавую і змястоўную гульню.

У гэтых спаборніцтвах разыгрывалася не толькі каманднае, але і асабістае першынство сустрэчы. Званне чэмпіёна заваяваў бліскуча выступіўшы ва ўсіх паядынках Г. Драбушэвіч, які набраў $5^1/_2$ ачкоў. Толькі на паўачка адсталі ад яго Г. Пятровіч і А. Тузік.

На першынстве было сыграна шмат цікавых партый. Вось адна з іх:

А. Стуканаў (матфак) — Г. Пятровіч (фізфак).

1. cb4 bc5 2. cd4 c:e3 3. d:d4 fg5 4. dc5 gf6 5. ba5 c:b4 6. a:c3 hg7 7. cd4 gh4 8. bc3 h:f2 9. d:g3 ab6 10. de3 fg5 11. gf2 gh4 12. gf4 gf6 13. ab4? hg5 14. f:h6 fe5 15. d:f6 e:g5 16. h:f4 bc5! Белыя здаліся. Прыгожая камбінацыя!

А вось партыя, якая вырашыла лёс першага месца:

А. Тузік — Г. Драбушэвіч.

1. cb4 de5 2. bc3 f4 3. g:e5 f:b2 4. a:c3 ba5 5. hg3 cb6 6. ed4 ed6 7. gf4 bc5 8. d:b6 a:c5 9. fg3 gf6 10. gh2 fe5 11. de3 hg7 12. cd4 e:c3 13. b:d2 de7 14. gh4 gf6 15. fg5 h:f4 16. e:g5 bc7 17. gh6 cd4 18. cb2 de5 19. bc3 d:b2 20. a:c1 ed4 21. cb2 cb6 22. ef2 ab4 23. hg3 ba5 24. fe3 d:f2 25. g:e1 ba3 26. bc3 dc5 27. fe3 ab4 і белыя здаліся.

Прыемна здзівіў сваёй ігрой лабарант хімфака С. Паламарчук, які выканаў другі разрад. У сустрэчы з двухразовай чэмпіёнкай СССР сярод студэнтак А. Хапалюк ён правёў цікавую камбінацыю і лёгка змог дабіцца выйгрышнай пазіцыі. Тут трэба было яму праявіць больш ініцыятывы. Але... пасля няўдалага другога ходу прыйшлося здавацца С. Паламарчуку.

Добра заявіў аб сабе на спаборніцтвах таксама і шашыст Кавалёў, які атрымаў некалькі выдатных перамог, у тым ліку і над А. Хапалюк. Высокай пахвалы заслугоўвае таксама ігра Ткачова і Галаўко. Усе яны выканалі другі разрад.

Г. АНТОНАЎ.

КАРАЛЕВА СПОРТУ ПРОСІЦЬ УВАГІ

Зімняе першынство нашага універсітэта па лёгкай атлетыцы, якое праходзіла 10—11 сакавіка на рэспубліканскім манежы, з'явілася праверкай падрыхтаванасці лёгкаатлетаў да прадстаячага летняга сезону. Усе чакалі, што за званне чэмпіёна разгарыцца ўпартая барацьба. Але спаборніцтва паказала іншае. Некаторыя факультэты, як геолага-геаграфічны, юрыдычны, філалагічны, выставілі на паядынкі далёка неўкамплектаваныя каманды, што не магло не адбіцца на барацьбе за першае месца. Гэта трывожны сімптом таго, што з каралевай спорту на гэтых факультэтах не ўсё ў парадку. Неўзабаве пачынаецца летні сезон. Як мы падрыхтаваліся да яго? Адказ на гэтае пытанне могуць даць вынікі прайшоўшых спаборніцтваў. Калі спартсмены ў скачках і бегу на розныя дыстанцыі паказалі вынікі першага разраду, то ў кіданні ядра толькі лепшы вынік адпавядаў II разраду. Гэта гаворыць аб тым, што лёгкаатлеты БДУ слаба падрыхтаваны да спаборніцтваў у рэспубліканскім маштабе... У ходзе паядынкаў першае месца заняў фізфак. Спартсмены факультэта набралі 13382 ачкі, другое — гістарычны — 11168 і трэцяе — хімфак — 10333 ачкі.

Г. МАЛОЧКА,
галоўны суддзя спаборніцтваў.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 17279. Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, I паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 605.